**ДОЎНАР Ларыса Іосіфаўна,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт БДУКіМ*

# ПА СЛЯДАХ ПРАВЕНЕНЦЫЙ ЕЛЬСКІЯНЫ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ КНІГАЗБОРУ АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА

Як пісаў Аляксандр Ельскі: «Абавязак жывых заключаецца ў тым, каб спадчына продкаў не гінула дарэмна, але, дбайна дагледжаная, заставалася духоўным пажыткам для наступных пакаленняў!»[1]

Да праблем даследавання кнігазбору А. Ельскага мы звярталіся неаднойчы, пачынаючы з 1999 г., калі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў была праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Універсітэты Ельскіх» (з удзелам нашчадкаў Ельскіх) і выдадзены матэрыялы канферэнцыі «Дзеля блізкіх і прышласці»[2]. Усяго да сённяшняга дня набралася 14 нашых публікацый, прысвечаных Ельскіяне[3] (дзве з іх ажыццёўлены

---

[1] Ельскі, А. Выбранае / А. Ельскі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — С. 106.

[2] Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — 156 с. : іл.

[3] «Драбніцы Ельскіяны» : матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага / склад. Л. Доўнар // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. — Мінск, 2008. — Вып. 2. — С. 150–171; Доўнар, Л. І. Ад «Драбніц Ельскіяны» да праекта электроннай рэканструкцыі «Бібліятэкі і музея старажытнасцей Аляксандра Ельскага» / Л. І. Доўнар // Матэрыялы Чацвёртых Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў «Новыя тэхналогіі ў захаванні дакументальных помнікаў» (Мінск, 20–21 ліст. 2008 г.) / Нац. б-ка Беларусі. — Мінск, 2008. — С. 224–239. — Бібліягр. : с. 231–232; Dounar, L. Dziedzictwo Jeskich a Białoruś (Na 170. rocznicę urodzin Aleksandra Elskiego) / L. Dounar // Jelscy wczoraj i dziś (500-lecie rodziny Jelskich herbu Pielesz) = Єльські вчора та сьогодні (500-річчя роду Єльських гербу Пелеш) / Książka została wydana przez Towarzystwo Kultury Polskiej Donbasu przy wsparciu Senatu RP I Fundacji «Pomoc Polakom na Wschodzie» =

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Данецку — па-беларуску і па-польску), 15-ы артыкул — «Biblioteka i Muzeum Starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu»: да гісторыі кнігазбору — знаходзіцца ў друку.

Першым крокам у вывучэнні кнігазбору А. Ельскага быў электронна-графічны каталог рэшткаў кнігазбору А. Ельскага ў Беларусі «Драбніцы Ельскіяны» — да адзначанай канферэнцыі «Універсітэты Ельскіх», дзе кніжная культура Беларусі была вызначана як адна з важнейшых складаючых сядзібнай культуры. Каталог уключаў навуковыя бібліяграфічныя апісанні і ілюстрацыі толькі 30 асобнікаў з кнігазбору А. Ельскага, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) і Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАНБ).

Выкананая праца мела працяг у дзвюх наступных грунтоўных публікацыях за 2008 г. — «Ад "Драбніц Ельскіяны" да праекта электроннай рэканструкцыі "Бібліятэкі і музея

---

Книжка видана Товариством польської культури Донбасу при сприянні Сенату РП та фундації «Допомога полякам на Сході». — Донецк : СПБ Дмитренко, 2007. — С. 280–288 : іл. с. 253–254, 256; Доўнар, Л. Спадчына Ельскіх і Беларусь. 170-годдзю Аляксандра Ельскага прысвячаецца / Л. Доўнар // Jelscy wczoraj i dziś (500-lecie rodziny Jelskich herbu Pielesz) = Єльські вчора та сьогодні (500-річчя роду Єльських гербу Пєлеш) / Książka została wydana przez Towarzystwo Kultury Polskiej Donbasu przy wsparciu Senatu RP I Fundacji «Pomoc Polakom na Wschodzie» = Книжка видана Товариством польської культури Донбасу при сприянні Сенату РП та фундації «Допомога полякам на Сході». — Донецк : СПБ Дмитренко, 2007. — С. 289–301 : іл. с. 253–254, 256; Доўнар, Л. Драбніцы Ельскіяны» ў сацыякультурнай прасторы (пра электронна-графічны каталог) / Л. Доўнар // Старажытны Тураў: Асвета і Святыні : тэз., даклады навук.-асветніцкай канф. (4 вер. 2004 г., г. Тураў). — Мінск, 2004. — С. 46–49. — Бібліягр.; Доўнар, Л. Лініі перасячэння, або Яшчэ раз пра «Універсітэты Ельскіх» / Л. Доўнар // Бібліятэчны свет. — 2000. — № 1 (14). — С. 21–23; Доўнар, Л. Даследаванне старажытных могілак ва ўрочышчы Кобань / Л. Доўнар, Я. Бондараў, А. Вайцяховіч [і інш.] // Наша слова. — Мінск, 2000. — 2 лют. — С. 6; Доўнар, Л. Універсітэты Ельскіх / Л. Доўнар // ЛіМ. — 1999. — 17 вер. — С. 15; Доўнар, Л. Слаўнай памяці Ельскіяны / Л. Доўнар // Культура. — 1999. — 18–24 вер. — С. 5; Доўнар, Л. «Ельскі да Ельскага...» : інтэрв'ю Уладзіміра Старасценкі / Л. Доўнар ; фота Т. Самайлюк // Культура. — 1999. — 6–12 ліст. — С. 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытнасцей Аляксандра Ельскага”» (апублікавана ў матэрыялах Чацвёртых Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў), «“Драбніцы Ельскіяны”: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага» (апублікаваны ў зборніку навуковых артыкулаў «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры»). Названыя артыкулы маюць важкае метадалагічнае, крыніцазнаўчае і перспектыўнае значэнне, бо ўключаюць матэрыялы і прапановы па комплекснай рэканструкцыі спадчыны Аляксандра Ельскага, а таксама вынікі даследавання яго кнігазбору — гэта навукова-бібліяграфічныя апісанні асобнікаў Ельскіяны, якія ўдалося выявіць у бібліятэках і архівах (на той час гэта 55 асобнікаў у Беларусі, 113 — у Польшчы, 25 — у Літве, 11 — у Расіі; усяго 204 асобнікі); спіс выяўленых перыядычных і шматтомных выданняў, дзе публікаваліся артыкулы А. Ельскага (21 назва), спіс бібліятэк і іншых фондасховішчаў, дзе захоўваюцца рэшткі Ельскіяны (друкаваныя выданні) (11 фондасховішчаў), спіс выяўленых архіваў і фондасховішчаў, дзе захоўваюцца рукапісы і рэшткі музейнай калекцыі А. Ельскага (23 архівы і фондасховішчы: Польшчы, Літвы, Украіны, Беларусі, Расіі, Ватыкана).

Сёння мы можам ужо на некалькі пазіцый дапоўніць дадзеныя звесткі. Так, напрыклад, да бібліяграфічнага спісу асобнікаў Ельскіяны дадаліся яшчэ 10 новых адшуканых выданняў: 9 — у НББ (дзякуючы Т. І. Рошчынай), адно — у Bibliotece Uniwersytetu Przyrodniczego ў Вроцлаве (дзякуючы прафесару Вроцлаўскага ўніверсітэта К. Міганю).

Зразумела, што 214 асобнікаў — гэта даволі сціплая лічба. Вядома ж, што замосцінскі кнігазбор А. Ельскага налічваў «звыш 10 тыс. кніжных адзінак, сярод якіх былі старадрукі, выданні XVII ст., амаль усе польскія і літоўска-беларускія хронікі, дыярыушы, розныя бібліяграфічныя даведнікі, энцыклапедыі, атласы, вопісы архіваў і г. д., багатыя матэрыялы па беларусістыцы»[4], сярод якіх было шмат матэрыялаў, прысвечаных Міншчыне.

---

[4] Мархель, У. І. Ельскі Аляксандр / У. І. Мархель // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1993. — Т. 2. — С. 420.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адзначаў у 1890 г. і сам А. Ельскі, «любай Міншчыне» ён аддаў звыш трыццаці год шчырай працы, каб грунтоўна яе пазнаць: «Гэта ж ва ўсіх адносінах калыска нашай нацыянальнай справы»[5]. Варта таксама адзначыць, што пры напісанні сваіх прац, прысвечаных, напрыклад, Радзівілам (пра ткальню паясоў у Слуцку, урэцкае шкло, Нясвіж і інш.), А. Ельскі грунтаваўся і карыстаўся арыгіналамі або копіямі рукапісных і друкаваных дакументаў, твораў мастацтва і матэрыяльнай культуры са сваёй дзесяцітысячнай калекцыі.

Дакументальныя і матэрыяльныя аб'екты, ашчадна збіраныя А. Ельскім, які разумеў іх каштоўнае значэнне, не адзін раз паслужылі і, спадзяёмся, яшчэ паслужаць для новых адкрыццяў, як пашчасціла А. Мальдзісу, В. Рагойшу, У. Казберуку, якія вярнулі ў літаратуру невядомыя беларускія творы, выяўленыя менавіта ў зборах А. Ельскага[6].

Адным з асноўных далейшых шляхоў пошуку асобнікаў Ельскіяны з'яўляюцца ўладальніцкія, правененцыйныя адзнакі — пячаткі: «Biblioteka i Muzeum Starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu», «Aleksander Jelski Zamość przez Gub. m. Mińsk», «Z biblioteki i museum starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu»; штампы і штэмпелі: «Zamosc Poczta Uzlany gub. Minska. Telegraf Rudziensk»; аўтографы Ельскага і Ельскаму. Дзякуючы менавіта ім праводзіцца пошук і ідэнтыфікацыя «драбніц» Ельскіяны.

«Любасць да грамадскіх спраў і рэчаў пан Аляксандр вынес яшчэ з бацькоўскага дому ў Дудзічах...» — як адзначае Юльян Талька-Грынцэвіч пра ўладальніка бібліятэкі і музея ў артыкуле да часопіса «Kraj» (1891. № 37)[7]. Пацвярджэннем

---

[5] Ельскі, А. Выбранае / А. Ельскі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — С. 435.

[6] Кісялёў, Г. В. Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. / Г. В. Кісялёў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — С. 78, 335.

[7] Мархель, У. «Кніга для запісу...», або 234 аўтографы / Уладзімір Мархель // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 25.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таму, што ў радзінным доме збіралі кнігі, можа з'яўляцца і надпіс «Exlibris Caroli Jelski» на тытульным аркушы чацвёртага тома «Dziel poetyckich» пад назвай «Tlomaczenia rozmaite» Адама Нарушэвіча (Adam Naruszewicz) (Варшава, 1778), што захоўваецца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НДАК НББ)[8]. Можна меркаваць, што некаторыя бацькоўскія зборы, як, да прыкладу, і нотны рукапіс з аўтографам А. Ельскага «Drogiego S. P. Ojca mojego Karola Jelskiego polonez...», зберагаліся ў сынавай замосцінскай бібліятэцы[9].

Сярод аматараў калекцыянавання ў шматлікім радаводным коле Ельскіх былі і іншыя асобы[10]. Напрыклад, бацькава сястра Барбара (нар. каля 1790 г.), пра што таксама сведчыць надпіс «Barbary Jelskiey» на тытульным аркушы кракаўскага выдання 1783 г. «Historya naturalna Królestwa Polskiego, czyli Zbiór krotki przez Alfabet ulozony, Zwierząt, Roslim, y Mineralów znayduiacych sie w Polszcze, Litwie; y Prowincyach odpadlych, zebrana» Ладоўскага (X. Ladowskiego S. P.)[11].

Да А. Ельскага трапілі, відаць, і кнігі Францішка Букатага, дыпламата, астатняга пасла Рэчы Паспалітай у Англіі, які быў жанаты з сястрой бабулі Аляксандра Ельскага (Барбары Прозар). Пасля вяртання з Англіі Ф. Букаты жыў у Сяргеевічах на Міншчыне, дзе памёр у 1797 г. і быў пахаваны ў крыпце ўніяцкай царквы ў Дудзічах, пабудаванай

---

[8] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 160. № 63.

[9] AGAD. III. Archiwum Prozorów i Jelskich. S.137. Гл. таксама: «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 170. № 21.

[10] Życiorys Ludwika Jelskiego, oficera wojsk Ks. Warszawskiego, francuskiego, ekonomisty, emigranta po r. 1831 — spisany przez prawnika inż. Jerzego Jelskiego / падрыхтаваў да публікацыі Анжэй Ельскі // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 48.

[11] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 159. № 61.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

яшчэ дзедам А. Ельскага Станіславам[12]. Захаваліся надпіс і пячатка ўладальніка замосцінскай калекцыі на лонданскім выданні 1774 г. «Experiments and observations on different kinds of air» Ёзафа Прыстлі наступнага зместу: «Ta książka była własnością Franciszka Bukatego…» (асобнік захоўваецца ў НДАК НББ).

Яшчэ адзін з асобнікаў НББ даносіць нам звесткі пра блізкія сваяцкія сувязі Аляксандра Ельскага і Вільгельма Ельскага, пляменніка і адначасова прыёмнага сына, якіх цесна яднялі таксама і інтарэсы абодвух у калекцыянаванні, грамадскай і гаспадарчай дзейнасці, на што меў непасрэдны ўплыў і сам А. Ельскі[13]. Надпіс на форзацы львоўскага выдання 1818 г. «Sybilla: poema historyczna we czterech piesniach» Прымаса Вароніча (Prymos Woronicz) засведчыў, што «1899 г. 28 Stycznia. № 17 […] «Szacow[n]y dublet z Biblioteki mojej ofiar. Drogiemu Synow[cowi] Wilhelm[owi] Jelskiemu […] Aleksander Jelski»[14]. Можна меркаваць, што «№ 17» мог абазначаць парадкавы нумар з агульнай колькасці кніг, ахвяраваных А. Ельскім свайму пляменніку ў яго кнігазбор.

Адначасова, пазначаная рукой А. Ельскага нумарацыя кніг, калі дапусціць, можа сведчыць і аб прысваенні парадкавага нумара асобніку з калекцыі дублетаў, якія чакалі свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[12] Федорук, А. Т. Ельские: землевладения и архитектурно-историческое наследие / А. Т. Федорук, Н. А. Федорук // Jelscy wczoraj i dziś (500-lecie rodziny Jelskich herbu Pielesz) = Єльські вчора та сьогодні (500-річчя роду Єльських гербу Пєлеш) / Książka została wydana przez Towarzystwo Kultury Polskiej Donbasu przy wsparciu Senatu RP I Fundacji «Pomoc Polakom na Wschodzie» = Книжка видана Товариством польської культури Донбасу при сприянні Сенату РП та фундації «Допомога полякам на Сході». — Донецк : СПБ Дмитренко, 2007. — С. 331, 336.

[13] Марачкіна, І. Вільгельм Ельскі / І. Марачкіна // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 99.

[14] «Драбніцы Ельскіяны» : матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 160. № 65.

340 867

часу і прызначаліся для абмену і дарэння. Так, як адбылося і з наступнай кнігай «Zbior deklaracyj, not y czynnosci Głownieyszych ktore poprzedziły y zaszły podczas seymu pod Węzłem Konfederacyi odprawuiącego się od dnia 18 wrzesnia 1772. Do 14 Maia 1773» (Варшава, канец XVIII ст.), ахвяраваный калекцыянерам Вільгельму Ельскаму: «Ten № 286 Dublet z biblioteki Zamo[jskiej] ofiaruję ku pamiątkę Kochanemu Synow[cowi] Wilhelmowi Jelskiemu [подпіс А. Ельскага]». Акрамя прыведзенага аўтографа чорнай тушшу на с. 2 верхняга форзаца «Zbioru deklaracyj...» тамсама змяшчаецца і пячатка «ALEKSANDER JELSKI ZAMOŚĆ» (асобнік захоўваецца ў НДАК НББ).

Акрамя сваяцкіх сувязяў выяўленыя асобнікі Ельскіяны паказваюць шляхі сяброўскіх, грамадскіх сувязяў і інтарэсаў А. Ельскага. Так, выданне «Łuzyce. Wrazenia z podrozy, poprzedzone krotkim opisem kraju i jego dziejow» (Варшава, 1891) Вільгельма Ельскага, якое таксама павінна было знаходзіцца і ў замосцінскім кнігазборы дзядзькі (сёння захоўваецца ў ЦНБ НАНБ — адзінкавы вядомы экзэмпляр[15]), на вокладцы якога захаваўся дарчы надпіс простым алоўкам «[...] od d-ra Kazim. Dmochowskiego / 20/ IX27». Патрабуе дадатковага вывучэння як тое, каму адрасаваны гэты падарунак, так і хто такі Казімір Дмахоўскі. З Дмахоўскімі Ельскія (а тыя і іншыя мелі шматлікія радаводныя разгалінаванні) маглі і перасякаліся неаднойчы. Так, «у часе вучобы на прыродазнаўчым факультэце Віленскага ўніверсітэта Генрых Дмахоўскі браў прыватныя ўрокі ў скульптара Казіміра Ельскага»[16]. Г. Дмахоўскі, як удзельнік лістападаўскага паўстання 1831 г., праследаваўся і быў у выніку выдадзены ўладам родным дзядзькам Казімірам Дмахоўскім, прэлатам Віленскай кафедры[17]. Некалькі прозвішчаў з вядомых віленскіх Дмахоўскіх адпаведнага

[15] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 163. № 31.

[16] Багадзяж, М. Жыццё Дмахоўскага / М. Багадзяж // Новы час. — 2003. — № 9 (14). — С. 14.

[17] Тамсама. — С. 14.

перыяду другой паловы XIX ст. — 1930-х гг. былі звязаны са сферай адукацыі, рэлігіі, права, мастацтва, краязнаўства, медыцыны. Сувязь А. Ельскага і К. Дмахоўскага ўсё ж можа аказацца аддаленай, бо і Аляксандр Ельскі і Казімір Дмахоўскі ўваходзілі ў склад сяброў Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego (спіс ад 31 снежня 1913 г.). Толькі першы — у якасці «korespondenta» з Ігуменскага павета ў ілюстраваным краязнаўчым штомесячніку «Ziemia», які выдавала таварыства, а другі — «popierającego» названага Польскага краязнаўчага таварыства ў Варшаве[18].

А пра што сведчыць надпіс «Z Biblioteki Duninow» на форзацы «Sybilly» (Львоў, 1818), адзначанага асобніка НББ? Ці тут патрэбна шукаць сувязь з Вінцэнтам Дунінім-Марцінкевічам, рукапісамі якога, па сведчанні сучаснікаў, і валодаў Аляксандр Ельскі (аказаліся страчанымі)[19]? Ці тут можа прасочвацца сувязь з іншымі Дунінымі?

У зборах бібліятэкі і музея старажытнасцей Аляксандра Ельскага ў Замосці захоўваліся шматлікія рарытэты з разнастайных прыватных збораў, пошукам і набыццём якіх яе ўладальнік, заўзяты бібліяфіл, таксама надаваў важнае значэнне. Адно з захаваных сведчанняў таму — пячаткі «Biblioteka Kanstantego Podwysockiego w Rychtach» на тытульным аркушы асобніка НДАК НББ «Mysli polityczne dla Polski» (Warszawa, 1789)[20]. Рыхты — уладанне князя Германа Галавінскага, якое размяшчалася недалёка ад Камянца-Падольскага (Украіна), а пазней і яго зяця Канстанціна Падвысоцкага (1810–1868), пісьменніка, літаратурнага крытыка

[18] Skowron, W. Mimo wojny PTK 1914–1918 / Wanda Skowron [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://khit.pttk.pl/index.php?co=tx_m_wojny_12. — Дата доступу: 10.03.2013.

[19] Марачкіна, І. Руплівец з Замосця / І. Марачкіна // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 56, 65.

[20] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 159. № 62.

і калекцыянера, куратара гімназіі ў Камянцы-Падольскім[21]. У Рыхтах, па сведчанні Антонія Роле (1829–1894), аўтара трохтомніка «Замкі падольскія на малдаўскіх ускраінах» (складзены на аснове калекцыі гістарычных дакументаў з архіва К. Падвысоцкага[22]), К. Падвысоцкі сабраў фамільны архіў і бібліятэку, якая налічвала больш за 12 000 тамоў. У кнігазборы былі, між іншым, Брэсцкая Біблія, шматлікія рукапісы гістарычных дакументаў і аўтографаў. Уладальнік Рыхтаў меў сталыя ўзаемасувязі ў тагачасным літаратурным свеце. Тут пабывалі Міхал Грабоўскі, Юзаф Крашэўскі, Аляксандр Вярыга-Дарэўскі, якія таксама калекцыянавалі карціны, гравюры, рукапісы і старадрукі. Пасля смерці К. Падвысоцкага яго калекцыі не суджана было застацца ў адным цэласным комплексе: рукапісы трапілі ў Ягелонскую бібліятэку, асноўная частка бібліятэкі і калекцыя гравюр была набыта Янам Дзялынскім з Курнікаў (Польшча), яшчэ адна частка бібліятэкі — букіністам з Львова Ігелем[23]; іншыя рыхтаўскія рэшткі разышліся па розных руках. У тым ліку можам бачыць іх след і да замосцінскай бібліятэкі Аляксандра Ельскага.

У сваіх справах, у тым ліку і калекцыянаванні, А. Ельскі заўсёды заставаўся даволі паслядоўным, захоўваючы традыцыі і перадаючы іх маладому пакаленню. Гэта прасочвалася як у сямейным коле (асабліва блізкімі былі ўзаемаадносіны з дачкой Аляксандрай, якая стала прадаўжальніцай справы бацькі)[24], так і ў працы дзеля беларускай літаратуры і культуры. Хоць не ўсе задумы і планы А. Ельскага былі ажыццёўлены.

Ужо ў 1890-х гг. Аляксандр Ельскі планаваў, каб у будучым перадаць свае замосцінскія зборы для публічнага

[21] Гл.: www.estreicher.uj.edu.pl/bazy.../index.../644/

[22] Rolle, A. (Dr. Antoni J.) Zameczki Podolskie na kresach multańskich. T. 1–3. / J. Antoni. — Warszawa : Nakł. Gebethnera i Wolffa ; Kraków : Gebethner i S-ka, 1880.

[23] Котлобулатова, І. Книгарі та книгарні в минулому Львова / І. Котлобулатова. — Львів : Аверс, 2005. — С. 53–66.

[24] Марачкіна, І. Руплівец з Замосця... — С. 58.

карыстання[25]. Пры сваім жыцці такія ахвяраванні ён зрабіў не аднойчы: у 1900 г. — Ягелонскай бібліятэцы Кракаўскага ўніверсітэта (каля 15 тыс. адзінак рукапісаў і архіваў родаў); у 1907 г. — Бібліятэцы Таварыства сяброў навукі ў Вільні (каля 5 тыс. рукапісных лістоў і 650 кніг)[26].

Маючы і падтрымліваючы шырокія сувязі і карэспандэнцыю з рознымі дзеячамі культуры, А. Ельскі дарыў і абменьваўся з імі кніжнымі рарытэтамі. Пасля смерці А. Ельскага ў 1916 г. «Бібліятэка і музей старажытнасцей у Замосці» толькі часткова былі ўратаваны яго нашчадкамі, ахвяраваны ці прададзены Ягелонскай бібліятэцы і Нацыянальнаму музею ў Кракаве, на кафедру археалогіі Ягелонскага ўніверсітэта, у Нацыянальную бібліятэку і Галоўны Архіў Даўніх Актаў у Варшаве, у Асалінэум у Вроцлаве і інш. Так, у фондах Галоўнага Архіва Даўніх Актаў у Варшаве знаходзіцца каля 30 асобнікаў кніжных выданняў з пячаткай «Aleksander Jelski Zamosc», а таксама з яго аўтографамі і аўтографамі да яго, напрыклад, Рамуальда Зямкевіча[27]. У фондах Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве выяўлена звыш 80 асобнікаў выданняў, у якіх А. Ельскі выступае як аўтар. Асноўная іх частка знаходзіцца ў фондзе Красінскіх, дзе сярод дублетаў ёсць і аўтографы А. Ельскага[28].

У 1931 г. унукам А. Ельскага Генрыхам было зроблена апісанне замосцінскай калекцыі, з якім можна пазнаёміцца дзякуючы публікацыі Генадзя Кісялёва ў гісторыка-літаратурным зборніку «Шляхам гадоў» (Мінск, 1990). Дадзены матэрыял служыць зыходным пунктам як для вызначэння складу кнігазбору А. Ельскага, так і для выбару шляхоў яго пошуку. У апісанні прыводзіцца інфармацыя аб некаторых

---

[25] Ilgowski, J. Z wycieczki na Białoruś / J. Ilgowski // Kraj. — 1891. — № 37 (13/25 września). — S. 7.

[26] Adrianek, M. Jelski Aleksander / M. Adrianek // Słownik pracowników książki polskiej. — Warszawa ; Łódź : Państwowe wydawnictwo naukowe, 1972. — S. 374.

[27] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — № 1–3. С. 167.

[28] Тамсама. — С. 164–167. № 1–73.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэдкіх і каштоўных выданнях XVI–XIX стст., якія былі перавезены ў гады Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў у Варшаву. Паводле шэрагу даследаванняў, напрыклад, Г. Кісялёва, А. Мальдзіса, У. Мархеля, І. Марачкінай і іншых можна акрэсліць асноўныя сучасныя межы захоўвання частак бібліятэчнай і музейнай калекцый А. Ельскага — гэта Польшча, Літва, Украіна, Расія і Беларусь.

У фондах НББ на сёння выяўлена 43 асобнікі Ельскіяны, прадметам даследавання якіх акрамя аўтографаў А. Ельскага сталі і правененцыйныя адзнакі Элізы Ажэшкі[29] і Яна Гіжыцкага[30].

Уладальніцкімі пячаткамі А. Ельскага пазначаны яшчэ дзве кнігі, якія належаць аддзелу рэдкіх кніг Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнаага музея[31]. Магчыма, тут можна прасачыць след перамяшчэння некаторых замосцінскіх збораў праз сына Ельскага Яна, які жыў і працаваў адвакатам у Мінску, а таксама суддзёй у Гродне (да выезду ў Польшчу). А з іншага боку, не выключана, што аўтографы, якімі пазначаны два гродзенскія асобнікі і адзін мінскі[32], Антонія Машынскага (Х. Antoni Moszyński, 1800–1893)[33], пісьменніка і педагога, пінскага пробашча, піяра, могуць

---

[29] Пугачова, С. Невядомы зборнік А. К. Ельскага з асабістай бібліятэкі Э. Ажэшка ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / Святлана Пугачова // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 85–91.

[30] Сільнова, Л. Ельскі. Ельскага. Ельскаму… / Людміла Сільнова // Дзеля блізкіх і прышласці : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння А. Ельскага), Мінск, 7 кастр. 1999 г. / [склад., прадм. Л. Доўнар, Т. Дзем'яновіч]. — Мінск : Бел. ун-т культуры ; Ковчег, 1999. — С. 76–85.

[31] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 156–159. № 50–53, 60, 62; С. 164. № 1–2.

[32] Тамсама. — С. 164. № 1–2; С. 157–158. № 53.

[33] Гл.: Encyklopedja koscielna podług teologicznej encyklopedji Wetzera i Weltego. — Warszawa : W druk. F. Czerwińskiego i S. Niemiery, 1883. — T. 15. — S. 164.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сведчыць пра кніжныя ўзаемасувязі, кнігаабмен паміж А. Машынскім і А. Ельскім.

Сцежкі, якія лучылі замосцінскага бібліяфіла з тагачасным кніжным светам, выводзяць і да публічных бібліятэчных збораў — «Библиотека Минской Духовной Семинарии», «Библиотека М. Г. Н. Унив-та им. Шанявского», Бібліятэкі Мінскага рэальнага вучылішча (з'яўляўся «членом попечительства при Минском Реальном Училище»)[34].

19 асобнікаў, выяўленых у ЦНБ НАНБ, тым ці іншым чынам звязаных з асобай Аляксандра Ельскага, у большасці сваёй сведчаць пра кніжныя стасункі А. Ельскага з Вільняй і Львовам. Так, кнігі, пазначаныя пячаткай «Książnica T-wa Przyjaciol Nauk w Wilnie» і аўтографамі А. Ельскага, могуць з'яўляцца менавіта тымі асобнікамі, якія ён падараваў у Бібліятэку Таварыства ў 1907 г. Пазней яны трапілі ў Бібліятэку імя Урублеўскіх — «Biblioteka IM Wrublewskich w Wilnie», якая потым склала аснову фонду Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы — «Biblioteka Lituvos Mokslu Akademija», а ўжо далей, у якасці копій ці дублетных асобнікаў былі перададзены ў ЦНБ НАНБ. Віленскае паходжанне маюць і два асобнікі з уладальніцкімі пячаткамі «Z Księgozbióru Wacława Wejtko», «Ze zbiorow A. Szutinasa w Wilnie». Так, напрыклад, Вацлаў Вейтка з'яўляўся адным з супрацоўнікаў Публічнай універсітэцкай бібліятэкі ў Вільні і, магчыма, меў пэўныя адносіны да Таварыства сяброў навук, бо яго асобнік беларускамоўнай брашуры А. Ельскага «Сынок!..» (СПб., 1895)[35] змяшчае пячатку з выявай факела — характэрнай адзнакі дадзенага Таварыства. А ў зборы А. Шуцінаса ў Вільню кніга А. Ельскага «Uwagi w Kwestyi włoscijan, a mianowicie: jak było u nas i gdzieindziej» (Варшава, 1884)[36], відаць, трапіла праз пошту ад самога аўтара, бо сведчаннем таму з'яўляецца штамп «Zamość. Poczta Uzlany gub. Mińska. Telegraf Rudzieńsk».

---

[34] НГАБ. — Ф.473. — Воп.1. — Спр.28. — Арк.109 адв. — 110 адв.

[35] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 161. № 14–18.

[36] Тамсама. — С. 163. № 28–29.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Врублеўскіх (БАНЛ) выяўлены пакуль толькі 17 кніжных асобнікаў, якія могуць быць аднесены ці звязаны з імем А. Ельскага (2 — з аўтографамі Ельскага-аўтара ў такіх выданнях, як «Hutarka ab tom, jakaja maja byc «Ziamla i Wola» Sielskamu narodu. Praudziwy abrazok, — zyucom zniaty z ciapierasznialio zyccia wioski na Bielaj Rusi, dauniaj Krzywiczyznia» (Вільня, 1906)[37] і «Dzieje Dyecezyi Minskiej w Zarysie» (Мінск, 1907)[38]. Аднак у фондах аддзела рукапісаў захоўваюцца і некаторыя іншыя аўтографы А. Ельскага, і, як відаць, не толькі з тых, якія ён калісьці падараваў Таварыству сяброў навук у Вільні ў 1907 г. Сярод арыгіналаў, напрыклад, збіраныя замосцінскім бібліяфілам Радзівілаўскія дакументы (F 273-1816), генеалогія Ельскіх і Скірмунтаў (F 43-25628), перапіска 1893–1913 гг. (F 151-203) і іншыя, якія сведчаць пра тое, як скрупулёзна ставіўся А. Ельскі да збору і ўліку кожнай адзінкі са сваёй калекцыі. Так, акрамя ўладальніцкай пячаткі «Biblioteka i Muzeum Starożytności Aleksandra Jelskiego w Zamościu» на адным з Радзівілаўскіх дакументаў (F 273-1816), набытых (ці прададзеных) А. Ельскім «Ex Collectione Alberti Ludovici Zasztowt. № 45», пазначаны № 3550 і кошт — «złot. 14. Gr. 24». Дарэчы, у фондах аддзела рукапісаў БАНЛ асобна вылучана калекцыя антыквара, з якім А. Ельскі меў перапіску, — Альберта Людовіка Заштаўта (памёр у 1918 г., большая частка яго збораў была вывезена нямецкімі салдатамі пад час Першай сусветнай вайны ў Берлін)[39], храналагічны перыяд дакументаў якой вызначаецца 1396–1907 гг. Для Беларусі яна таксама можа

---

[37] «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 161. № 2–13.

[38] Тамсама. — С. 155–156. № 36–43.

[39] Fuchs, T. Bibliothek und Militär. Militärische Büchersammlungen in Hannover von 18. bis zum 20. Jahrhundert / Thomas Fuchs // Zeitschrift für Bibliothekswesen und Bibliograhie. — Frankfurt/Main, 2008. — Sonderband 93. — S. 170.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўяўляць пэўную цікавасць з пункту гледжання выяўлення і ўліку рукапіснай спадчыны Радзівілаў[40].

Сярод васьмі асобнікаў Ельскіяны, якія захоўваюцца ў Навуковай бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта, ёсць і адзіны вядомы на сёння рарытэт аўтарскай працы Аляксандра Ельскага «Garść myśli o marności doczesnej» (Вільня, 1909)[41].

НДАК НББ таксама можа пахваліцца адзіным вядомым у Беларусі арыгінальным асобнікам сабраных і надрукаваных А. Ельскім у 1908 г. у Вільні «100 prykazak, zahadak, prydumak i gawendau dla pazytku Bielaruskaho (Krywickaho) narodu»[42]. Брашура належала, як сведчыць пячатка на яе вокладцы, Язэпу Лёсіку — «Кніжніца Язэпа Лёсіка». Шлях гэтага выдання да дзяржаўных фондаў можа быць звязаны і з трагічным лёсам яе ўладальніка, Язэпа Лёсіка, які быў арыштаваны ў 1930 г. (не стала ў жывых у 1938 г.), а ўся яго перапіска, рукапісы былі забраны, як была рэквізавана бібліятэка, якая змяшчала старыя кніжныя выданні, часопісы і газеты. Магчыма, «100 prykazak...» трапілі да Я. Лёсіка яшчэ на пачатку яго супрацоўніцтва з «Нашай Нівай», і з дапамогай нашаніўцаў, калі ён быў на царскай высылцы, а магчыма, і пасля яго вяртання ў 1917 г. у Мінск. Вядома, што Я. Лёсік быў заўзятым аматарам кніг, іх збіральнікам. Таму не выключана, што да яго таксама магло трапіць штосьці з рэшткаў Ельскіяны ў гэтыя віхурныя гады.

На пачатку 2010 г. у Вроцлаве ў Бібліятэцы ўніверсітэта прыродазнаўчых навук (W bibliotece Uniwersytetu Przyrodniczego we Wrocławiu), як стала нам вядома дзякуючы прафесару Кшыштафу Міганю, быў выяўлены яшчэ адзін асобнік з Ельскіяны — Lelewel, Joachim. Bibliograficznych Ksiąg Dwoje, w których rozebrane i pomnozone zostały dwa

---

40 Albert Liudwik Zasztowt Collection [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.balticconnections.net. — Дата доступу: 10.03.2013.

41 «Драбніцы Ельскіяны»: матэрыялы да рэканструкцыі прыватнай кніжнай калекцыі Аляксандра Ельскага. — С. 171. № 1.

42 Тамсама. — С. 152. № 13–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ